

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

У Ельску супрацоўнікі гомельскага АМАПу «палююць» на мясцовых грамадзян

@palieskajaviasna паведамляе пра дзікунскія паводзіны гомельскіх амапаўцаў у Ельску. Суразмоўца, які пажадаў застацца ананімным, паведамляе, што вечарамі **аўтамабіль АМАПу з'яўляецца ў цэнтры гарадка і спыняе запозненых мужчын. Іх вядуць у аўтамабіль, дзе моцна збіваюць, а потым адвозяць на ўскрайку горада і адпускаюць.**

Апошні выпадак здарыўся літаральна пару дзён таму: мужчыну, які выйшаў з мясцовай кавярні пакурыць, схапілі і брутальна збілі. Пры гэтым ніякіх абвінавачанняў не прад'яўляюць.

Людзі баяцца звяртацца нават у мясцовы райаддзел міліцыі.

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy